Таким образом, Совет молодых учёных факультета журналистики принимает активное участие в научной и образовательной деятельности факультета и является объединением, аккумулирующим в первую очередь научные устремления молодых учёных структурного подразделения Белорусского государственного университета.

**Кахновіч Віктар Адамавіч**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (Мінск, Беларусь)*

## ХІМІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ БДУ У ВАЕННЫ І ПАСЛЯВАЕННЫ ЧАС (1940–1951 гг.)

Хімічны факультэт БДУ на сёння ёсць важным навуковым і навукова-педагагічным асяродкам у Беларусі, свайго роду флагман НТП у краіне. Хімфак БДУ быў створаны ў кастрычніку 1931 г. Аднак вытокі хімічнай навукі ў БДУ адносяцца да самага пачатку працы ўніверсітэта. Так, у 1922 г. вялося выкладанне хіміі на медыцынскім і педагагічным факультэтатах БДУ. У складзе педагагічнага факультэта БДУ (1922–1931 гг.) дзейнічалі кафедры арганічнай хіміі і аналітычнай хіміі. Пасаду прафесара, а зачыць і фактычнага загадчыка згаданых кафедраў, займаў з 20 чэрвеня 1922 г. праф. А.С. Усаў, дацэнт Маскоўскага ўніверсітэта [1, арк. 26 адв.]. Асноўная праца кафедраў вялася на медыцынскім факультэце; так было да 1931 г. [2, арк. 10, 26 адв. – 27, 68–69]. Апроч таго, з дакуметаў вынікае, што ў складзе педфака ў пачатку 1920-х гг. лічылася кафедра неарганічнай хіміі, якую займаў праф. Б.М. Беркенгейм, які выкладаў на педфаку неарганічную хімію, уводзіны ў фізічную хімію і радыяактыўнасць [2, арк. 10, 39, 96 адв.]. З улікам таго, што на 1922/1923 г. на медфаку працаваў 31 выкладчык, было 549 студэнтаў, – вынікае, што хімічная навука з 5 выкладчыкамі – была вельмі вузкім напрамкам у БДУ у тыя першыя гг. яго існавання [2, арк. 28]. Аб’ём выкладання такой важнай і складанай дысцыпліны, як хімія, быў мізэрны; прычым і на педагагічным і на медыцынскім факультэтах. БДУ знаходзіўся ў стадыі фарміравання матэрыяльна-тэхнічнай і адукацыйнай базы. У 1928–1930 гг. было 9 хімікаў ў БДУ – яўна недастаткова для патрэб выкладання.

Пасля вылучэння з БДУ у жніўні 1930 г. асобнага Беларускага медыцынскага інстытута, хімікі БДУ атрымалі асобны факультэт, дзе важнае значэнне мела развіццё арганічнай хіміі і хіміка-тэхналагічнага напрамку, што развіваліся па ініцыятыве праф. М.А. Прылежаева [2, арк. 42, 68].

Выключная роля ў развіцці маладога хімфака БДУ адыгрывалі ў 1930-я гг. праф. М.А. Прылежаеў, дэкан у 1931–1934 гг., а таксама ўраджэнец Міншчыны праф. Э.В. Змачынскі, дэкан у 1931, 1934–1937 гг. У гэты час істотна пашыраецца прафесарска-выкладчыцкі склад факультэта: на хімфак прыйшлі праф. М.Ф. Ярмоленка, што ачоліў кафедру аналітычнай хіміі, праф. Ф.Г. Асіпенка, а таксама прадстаўнікі малодшага пакалення: вучні Прылежаева і Змачынскага – Н.А. Пракапчук, А.М. Прылежаева, А.А. Будкевіч, М.М. Дудзінскі, А.С. Баркан, а таксама прыбылыя ў 1936/1937 гг. М.М. Паўлючэнка,

Б.В. Ярафееў, М.С. Казлоў. Між тым, з 1937 г. і, відаць, да 1950-х гг. вострай заставалася праблема забяспечанасці кадрамі. Яшчэ ў 1932 г. праф. У.І. Пічэта абазначыў тгэтыу праблему, якую М.А. Прылежаеў і Э.В. Змачынскі спрабавалі вырашыць. Аднак пад ціскам сталінскіх рэпрэсій стварыць трывалы і высокакваліфікаваны калектыў не ўдавалася: быў арыштаваны Э.В. Змачынскі, М.С. Казлоў, мусіў выехаць М.Ф. Ярмоленка, а выкладанне ва ўніверсітэце пакінулі М.А. Прылежаеў, Б.В. Ярафееў. Па стану на пачатак вайны кафедры хімічнага факультэта заставаліся невялікі і відавочна недаўкамлектаванымі (3-5 чал.). Таго відавочна не хапала для выкладання на хімічным, біялагічным, фізіка-матэматычным і іншых факультэтах універсітэта. Да прыкладу, пасля арышту ў 1938 г. М.С. Казлова вакантная заставалася пасада загадчыка кафедры фізічнай хіміі. Паводле архіўных дакументаў, на гэтую пасаду хацелі запрасіць віцэ-прэзідэнта АН БССР акад. С.М. Ліпатава, але, з адсутнасці сведчань у крыніцах, бачна, што ўвасобіць гэты план не ўдалося. Фактычна функцыі загадчыка згаданай кафедры выконваў малады выкладчык фізічнай хіміі, кандыдат хімічных навук (1938) М.М. Паўлючэнка. І тое было яшчэ да эвакуацыі БДУ на станцыю Сходня, а затым на працягу пацы БДУ у Сходне і пасля.

Між тым, да 1941 г. хімічны факультэт падыйшоў у цэлым у не вельмі спрыяльным стане. Бурнае развіццё ў Савецкім Саюзе і свеце атрымалі новыя напрамкі хімічнай навукі і прамысловасці (калоідная, фізічная, хімія палімераў), з поступам чаго хімфак БДУ праз недахоп кадраў не зусім паспяваўю Так, у 1940 г. з’явілася кафедра калоіднай хіміі, якую ачоліў А.А. Будкевіч, што адначасна ачаольваў кафедру аналітычнай хіміі. Апроч таго недастатковая была матэрыяльна-тэхнічная база факультэта. Да прыкладу, са справаздачы за 1939–1941 гг. дэкана хімфака І.П. Маркоўкі вядома, што навукова-даследчая работа факультэта была разгорнута слаба, бо да таго вялі аб’ектыўныя ўмовы функцыянавання факультэта: было халодна ва усіх аўдыторыях і лабараторыях хімкорпуса (тэмпература складала 4-5 $^{0}$С), назіраўся адчувальны дэфіцыт рэактываў, недахоп плошчаў і ўмоваў для зберагання рэактываў, недахоп посуду, адсутнасць вады і электрычнасці, дапаможнікаў. Апроч таго назіраўся празмерны і дробязны кантроль за навучаннем і паспяховасцю студэнтаў і выкладчыкаў [4, арк. 4, 11, 44]. Між тым, менавіта ў тыя часы рабілі свае першыя крокі калоідная (А.А. Будкевіч) і фізічная хімія (М.М. Паўлючэнка), развіццё якіх рушыла ў пасляваенны час.

Трэба сказаць, што усе акрэсленыя вышэй абставіны прывялі ў свой час да таго, М.М. Паўлючэнка ў 1930–1933 гг. навучаўся менавіта на хімічным факультэце МДУ у Маскве. Падобна, праф. М.С. Казлоў і В.К. Нікіфараў былі выхадцамі з МДУ, што быў накіраваны ў Мінск, каб павысіць узровень хімічнай навукі ў беларускай рэспубліцы. Пасля арышта Казлова і Нікіфарава Прылежаеву аднаасобна давялося выкладаць фізічную хімію ў БДУ. І хаця крыніцы адзначаюць паспяховую выкладчыцкую працу Паўлючэнка, відаць, што для паўнацэннага вядзення курсаў фізічай і калоіднай хіміі не хапала сіл. Так, калі ў 1932 г., на самым пачатку існнення дысцыпліны ў навучальным працэсе, фізічная і калодная хімія чыталася ў аб’ёме 216

гадзін, то ў 1941 г. М.М. Паўлючэнка выкладаў такі курс у аб'ёме 42 гадзін. [5, арк. 4, 14]

Зразумела, што з пачаткам вайны і ва ўмовах працы унівестэта ў эвакуацыі, – мачымасці для нармальнай працы факультэта не толькі не пашырыліся, але максімальна звузіліся. Вядома, што на ст. Сходня пад Масквой аднавілі сваю працу 6 факультэтаў (філалагічны, гістарычны, фізіка-матэматычны, хімічны, біялагічны, геаграфічны) і 35 кафедр. Сярод іх на хіміфаку было 4 кафедры. Між тым, калі паводле штату на факультэце мусіла быць 8 выкладчыкаў, але па факту іх было 5 чалавек. Так, не змаглі праз шэраг прычын вярнуцца для выкладання праф. М.А. Прылежаеў, дац. А.А. Будкевіч, У.С. Баброўнікаў [6, арк. 21]. Звяртае ўвагу і тая акалічнасць, што былі складзены спісы з 70 студэнтаў хімфака ад даваеннага часу, але з іх да заняткаў змагло прыступіць 32 студэнта (26 з іх былі ўраджэнцамі БССР, што апынуліся ў эвакуацыі). З дакладу рэктара П.П. Савіцкага сакратару ЦК КП(б)Б П.К. Панамарэнка вядома, што БДУ на Сходне адчуваў вялізныя цяжкасці: «…необходимо было хотя бы минимально удовлетворить нужды студентов в одежде и обуви», «работа БГУ крайне тормозилась недостаточностью как учебников, так и жилой базы, недостатком средств, транспорта и оторванностью от республиканских органов» [6, арк. 24].

Універсітэт займаў 2 невялікія будынкі на станцыі, з якіх на долю хімічнага факультэта прыходзілася літаральна некалькі пакояў. Несумненна, ні пра якую напрмальную працу і навучальны працэс у такіх умовах гаварыць не даводзілася. Рабілася тое, што было магчыма, какб студэнты атрымалі прынамсі тэарэтычную падрыхтоўку. Да таго трэба дадаць адсутнасць нармалёвых умоваў для пражывання выкладчыкаў і стэдэнтаў. У такіх без перабольшання экстрэмальных абставінах хімічны факультэт ачоліў М.М. Паўлючэнка. Ён не толькі вырашаў масу арганізацыйных пытанняў, але і вёў заняткі па некалькіх дысцыплінах. Істотнай падтрымкай для яго стала супраца з дачкой праф. М.А. Прылежаева Аленай, што выкладала ў БДУ на ст. Сходня ў 1943–1944 гг. арганічную хімію, а таксама асістэнт Паўлючэнка яшчэ з даваеннага часу Н.І. Карповіч. [6, арк. 24; 7, арк. 11–12]

Не прасцейшымі былі часы пасля пераезду ў верасні 1944 г. БДУ у Мінск, а таксама ў першыя пасляваенныя гг.. 16 кастрычніка 1944 г. хімфак аднавіў сваю працу на базе больш-меньш ацалела корпусу фізіка-матэматычнага корпусу БДУ. Аднак факультэт займаў усяго 7 пакояў (170 м$^2$), прычым, «ні адзін з іх не быў прыстасаваны для практычных заняткаў: адсутнічала электрычнасць, вада і каналізацы». І тое ў варунках таго, што паводле ацэнкі Паўлючэнка, для мінімальна нармальнай працы хімічнага факультэта патрабавалася 20 пакояў (750 м$^2$). Аднак, па словах таго ж М.М. Паўлючэнка, былі да II семестру арганізаваны 4 лабараторыі, а таксама ў нейкай меры ўдалося стварыць базу для заняткаў у лабараторыях, хоць і не для навукова-даследчай працы. Як і раней востра адчуваўся дэфіцыт кадраў. Так, да 1946 г. заставался вакантнай кафедра аналітычнай хіміі. Не болей як 2 дацэнты было на кафедрах неарганічнай і арганічнай хіміі. Адчувалася таксама нястача ў рэактывах, абсталяванні, навучальных дапаможніках. Таму ў першым семестры навучальны план быў выкананы на 70%, а ў другім –

на 87%. Часта заняткі часта зрываліся (у 1944/1945 г.), бо «студэнты ехалі па хлеб», «ехалі па кнігі», «ехалі за прадуктамі». Як вынік, з 30 студэнтаў 1 курса засталося толькі 25, а з усіх 87 студэнтаў факультэта – 77. Выпуск у паваенны навучальны год склаў усяго 11 чал. [7, арк. 4, 12, 21]

Нягледзячы на гэтыя пасляваенныя праблемы, пісаў Міхаіл Міхайлавіч Паўлючэнка: «усё кафедры працавалі добра; супрацоўнікамі і іх кіраўнікамі праведзена вялікая праца па арганізацыі вытворчага працэсу». Прыкладзеныя намаганні дазволілі наладзіць працу кафедраў і факультэта, хоць ранейшыя цяжкасці ў цэлым заставаліся. Так, яшчэ і ў 1949/1950 навучальным годзе, калі дэканам хімічнага факультэта быў ужо А.А. Будкевіч, як і раней адчуваўся недахоп абсталявання, а лабараторыі патрабавалі электрычнасці і вады. Невялікім быў і лік студэнтаў: на 1-й курс паступіла 25 чал., што было столькі ж, як і ў даваенныя 1939–1940 гг. Але ў другой палове 1940-х гг. удалося вырашыць нарэшце кадравую праблему: да працы на факультэце вярнуліся Аляксандр Антонавіч Будкевіч, Фама Георгіевіч Асіпенка, Барыс Георгіевіч Асіпенка, а таксама далучылася новае пакаленне хімікаў, выпускнікоў хімфака БДУ, – Іван Грыгоравіч Цішчанка, Грыгорый Лазаравіч Старобінец, Васіль Раманавіч Скараход. [8, арк. 5, 23; 8, арк. 17]

З дакументаў бачна, што якасны пералом у працы хімічнага факультэта адбыўся ў 1950-я гг., а менавіта калі дэканам быў Г.Л. Старобінец. У 1951 г. на 1-ы курс паступала ўжо 50 чал., а ў 1954 г. набор студэнтаў дасягнуў 100 чал. Да таго часу было вырашана пытанне з абсталяваннем вучэбна-вытворчых лабараторый, у неабходнай колькасці з’явіліся рэактывы і спецыяльны посуд, былі створаны ўмовы для бяспечнага і належнага правядзення хімічных рэакцый і вопытаў. Апроч таго, нарэшце была вырашана праблема кадравага голаду на факультэце. А ў 1958 г. было адкрыта нават вячэрнае аддзяленне, што раней не было магчыма. [8, арк. 4, 11, 44; 9, арк. 41, 43, 50]

Як вынік, можна канстатаваць, што перыяд з 1940 па 1951 г. быў надзвычай цяжкім у гісторыі хімічнага факультэта БДУ. І справа тут не толькі ў ваенных абставінах і умовах, але найперш у тым палітычным тэроры, што разгарануўся супраць інтэлегенцыі ў часы сталінізму. Так, зусім недарэчнымі і проста безсэнсоўнымі бачацца рэпрэсіі супраць Э.В. Змачынскага, М.С. Казлова і В.С. Нікіфарава, інш. Гэта разбурала падмурак нармалёвай працы хімічнага факультэта, аб чым прама сведчыць справаздача дэкана І.П. Маркоўка за 1939–1941 гг. аб працы факультэта. Такім чынам, напачатку працу факультэта паралізавала ўнутранная палітычная вайна праўлячай партакратыі, а затым ужо і дзеі знешніх акупантаў. Амаль на 15 год годная праца факультэта была паралізавана, а гэты час мог стаць больш эфектыўным і прыдатным для навукі і асветы ў БДУ. Паказальны тут прыклад рэктара БДУ у 1938 г., кандыдата хімічных навук Уладзіміра Сцяпанавіча Баброўніцкага. Ён прыйшоў у БДУ з Горы-Горацкай аграрнай акадэміі, быў спецыялістам па арганічнай хіміі. Нягледзячы на яго прызначэнне ў БДУ па ініцыятыве партыйных структур, па іх жа волі ён быў арыштаваны ў ліпені 1938 г. як «шкоднік» [10, арк. 11]. Даказаць яго віну, аднак, не ўдалося. Таму,

напэўна, не варта апраўдваць хібы злачыннай сталінскай эпохі, пра што можна знайсці адказ у гісторыі хімфака БДУ.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. Кохнович, В.А. Основатель национальной школы химиков-органиков. Николай Александрович Прилежаев / В.А. Кохнович // Интеллектуальная элита Беларуси. Основоположники белорусской науки и высшего образования (1919–1941) / С.В. Абламейко [и др.] ; под общ. ред. С.В. Абламейко, науч. ред. О.А. Яновский. – Минск : БГУ, 2017. – С.190–196.
2. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Фонд 205. – Воп. 1. – Спр. 55.
3. НАРБ. – Фонд 205. – Воп. 6. – Спр. 4.
4. НАРБ. – Фонд 205. – Воп. 6. – Спр. 146.
5. НАРБ. – Фонд 205. – Воп. 6. – Спр. 241.
6. НАРБ. – Фонд 205. – Воп. 6. – Спр. 242.
7. НАРБ. – Фонд 205. – Воп. 6. – Спр. 251.
8. НАРБ. – Фонд 205. – Воп. 7. – Спр. 97.
9. НАРБ. – Фонд 205. – Воп. 7. – Спр. 404.
10. НАРБ. – Фонд 205. – Воп.7. – Спр. 4443.



**Келлер Ольга Борисовна**
*Тюбингенский университет имени Эберхарда Карла*
*(Тюбинген, Германия)*


## О ДЕСЯТИЛЕТНЕМ СОТРУДНИЧЕСТВЕ МЕЖДУ ИСТОРИКАМИ БГУ И ТЮБИНГЕНСКОГО УНИВЕРСИТЕТА ИМЕНИ ЭБЕРХАРДА КАРЛА (ЗАПАДНАЯ ГЕРМАНИЯ)

2019 год богат на юбилеи. Это год довольно важных событий в истории становления и развития немецкой и белорусской государственности. Началом собственно немецкой истории принято считать 919 г., когда в Восточно-Франкском королевстве начала править династия Оттонов. Что касается истории белорусской государственности, то 1 января 1919 г. в Смоленске была провозглашена БССР – первое собственно белорусское государство, предшествовавшее современной Республике Беларусь.

Наряду с такими крупными юбилеями хотелось бы отметить и небольшой, но достаточно важный юбилей в области сотрудничества между историческим факультетом БГУ и историческим / философским факультетом Тюбингенского университета имени Эберхарда Карла. Именно 10 лет назад, в 2009 г., и зародилось это сотрудничество.

Несколько слов об одном из старейших университетов Германии. Своё начало история Тюбингенского университета берёт в 1477 г., когда граф Эберхард Бородатый основал в Вюртемберге университет. В старой части города нет практически ни одного дома или площади, которые не были бы связаны с одним из знаменитых учёных своего времени: с Гегелем, Хёльдерлином, Шеллингом, Мёрике, Уландом, Иоганом Кеплером, Вильгельмом Шикардом. Посему, сам город Тюбинген, вне всякого сомнения, можно считать городом науки и исследований. На 85 500 его жителей приходится порядка 28 300 студентов из-за рубежа и из самой Германии.